Даследчык шмат вандруе па знакамітым месцам Беларусі. Шукае страчаныя гістарачныя каштоўнасці.

Адкрыццё музея Уладзіміра Караткевіча ў Оршы, знаёмства там са сваякамі, жаданне адчуць ягонны дух у рабочым кабінеце, прагнае ўслухоўванне ва ўспаміны сяброў, нецярплівае чытанне кожнай новай, раней не друкаванай, рэчы пісьменніка нарадзілі думкі расказаць чытачу аб жыцці і творчасці Караткевіча. Штамлікая настойлівая праца прывяла да стварэння кнігі "Жыццё і узнясенне Уладзіміра Караткевіча". Ужо на першых старонках выдання чытач даведваецца аб незнаёмых і цікавых фактах яго творчай і жыццёвай біяграфіі. Ён перасцерагае чытача, што выданная кніга суб'ектыўная. "Я далекі ад таго, каб прэтэндаваць на нейкія ісціны ў апошняй станцыі, бо апіраючыся пераважна на тое, што асабіста бачыў і чуў, што было занатавана, прызнаюся ў гэтым, адразу ж, вечарамі ці на наступны дзень, а то і непасрэдна ў час выступленняў Караткевіча ў самых розных аўдыторыях. Праўда мушу пакаяцца: на пачатку нашага знаёмства ў гады шасцідзесятыя яшчэ не усведамляючы ўсей значнасці таго, што адбываецца на маіх вачах, усей адказнасці перад гісторыяй такія занатоўкі я рабіў рэдка і бегла" [1].

У свой час літаратуразнаўца адшукаў шмат беларускіх музычных твораў. Найперш – "Аршанскі зборнік", які захоўваецца ў Кракаве ў бібліятэцы Чартарыжскіх, што мелі самыя багатыя маёнткі пад Оршай. Зборнік даказаў, што поўнага заняпаду беларускай літаратуры ні ў XVII, ні ў XVIII стагоддзі не было.

"Аршанскі зборнік" - гэта ў асноўным тое, што мы цяпер называем масавай песняй. Стварався ён шкалярамі, вандроўнымі камедыянтамі, якія хадзілі ад хаты да хаты, ад мястэчка да мястэчка, зарабляючы сабе на хлеб вершамі і песнямі. Творы гэтыя назвычай цікавыя". Адам Мальдзіс лічыць, што ў іх "цэлая гама пачуццяў – ад цнатлівага, да далікатнага апісання кахання, да вельмі эратычнага, - такога, што сёння магчыма не кожны радактор згадзіўся б надрукаваць[2].

І самыя важныя гэтыя творы напісаны па ўсіх канонах барока: пераканаўчы аргумент для тых, хто лічыць, што у беларусаў ні рэнесансу, ні класіцызму, ні барока не было."

Творы і працы А. Мальдзіса перакладзены амаль на дзесятак замежных моў. Ён член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1967 г., лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа. Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.


Літаратура:

1. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча. Эсе / А. Мальдзіс. – Мінск: 1990.
2. Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў / А. Мальдзіс. –Мінск: 1974.
3. Васілёнак М. У рабочым кабінеце прафесара / М. Васілёнак //Астравецкая праўда. – 2002. – 16 студзеня.
4. Віват, кароль!:Адам Мальдзіс – 70 год //Свободные новости. – 2002. – 6 студзеня
5. Багдановіч, І.Карэліцкі тост: Адму Мальдзсу / І. Багдановіч //Крыніца. – 1998. – №5. – с. 45.


## ВОБРАЗ-АРХЕТЫП ДРЭВА Ў ТВОРЧАСЦІ А. РАЗАНАВА


Мхаян А.С.,

студэнтка 5 курса УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», г. Гомель, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – Брадзіхіна А.В., канд. філал. навук, дацэнт


З выкарыстаннем структурна-аналітычнага і герменеўтычнага метадаў даследавання ў артыкуле зроблена спроба асэнсавання архетыпу Сусветнага дрэва ў творчасці А. Разанава. Архетып дрэва з'яўляецца самым старажытным і найбольш распаўсюджаным у сусветнай культуры, валодае глыбокай і шматграннай сімволікай.

Адным з вобразаў, праз якія рэалізуецца Сусветнае дрэва, у міфалогіі беларусаў з'яўляецца яблыня. У мастацкай свядомасці А. Разанава квітнеючая яблыня з'яўляецца ўвасабленнем маладосці. У вобразе гэтага дрэва лірычны герой бачыць сваё мінулае (пункцір "Узняўся…"), выражае боль аб страчанай маладосці ("У слёзах…"). Адчуваючы складанасць, а часам і ўсеагульную немагчымасць асэнсавання моманту змены маладосці старасцю, паэт спрабуе адлюстраваць імгненне, калі першая ўжо адышла, а другая яшчэ не паспела прыйсці. А. Разанаў, падобна да мастака-імпрэсіяніста, выхоплівае з хранатопу адну яго кропку: "Дзе – старасць,// дзе – маладосць?! // Зацвілі // яблыні сёння" [1, с. 68].

Працягваючы нацыянальныя традыцыі, А. Разанаў надае дамінантную ролю вобразу дуба, робіць яго дрэвам дрэў, надзяляе асаблівымі ўласцівасцямі: "большай драўлянасцю, дрэвавасцю" [2, с. 370]. Так, у версэце "Дубы Заходняга краю" дуб-волат сімвалізуе не толькі моц, сілу, вечнае жыццё, але і Радзіму. У адрозненне ад людзей ён дакладна ведае сваё прызначэнне. Моцна трымаючыся каранямі за зямлю, дуб стагоддзямі назапашвае мудрасць пакаленняў. Ён настолькі магутны, што набывае здольнасць трансфармаваць хронас: парушаць яго лінейнасць, утрымліваць у сабе адначасова мінулае, цяперашняе і будучае. Дуб становіцца адзіным досведам, дзякуючы якому лірычны герой знаходзіць сваю апору – Айчыну, а значыць і сэнс жыцця.

Лірычны герой А. Разанава называе дрэвы сваімі братамі і сёстрамі (версэт “Дрэвы”). Такім чынам паэт увасабляе народныя вераванні, паводле якіх душы памерлых перасяляюцца ў дрэвы. Тым не менш гэты матыў прачытваецца і ў межах арыентальнай філасофіі. Адметна, што ўяўленні пра сваяцтва чалавека і дрэва адлюстраваны і ў японскай міфалогіі, на гэтым павер’і заснавана іх нацыянальнае мастацтва ікебаны. Кампазіцыйна букет павінен складацца з трох частак, якія ўвасабляюць чалавека паміж небам і зямлёй. Ікеноба Сэнкей сцвярджаў, што ў ікебане японцы аранжыруюць “адну маленькую галінку і адну кветку ў бязмежнай касмічнай прасторы і бясконцым часе” [3]. Бясконца блукаючы ў межах такога топасу, лірычны герой версэта спрабуе адшукаць існасць быцця. І толькі ў паралельнай прасторы (у сне) ён прыходзіць да жаданага выніку: знаходзіць яблык, горкі і адначасова салодкі, што, утрымліваючы супрацьлеглыя пачаткі, з’яўляецца сімвалам ведаў, пазнання.

Такім чынам, сінтэзуючы беларускія і японскія традыцыі, А. Разанаў прыходзіць да высновы, што дрэва – “злом прасторы” [4, с. 130], месца, дзе рэальны топас перасякаецца з хтанічным. З дапамогай архетыповых вобразаў А. Разанаў стварае хранатоп, які падуладны мадыфікацыі і трансфармацыі:

Ні змрок, ні святло,
Ні ўчора, ні сёння.
Не ведаюць дрэвы, ці ім зеля-
нець далей, ці скідаць лістоту.
Не разумеюць вароны, ці ім куды
адлятаць, ці сядзець на дрэвах [4, с. 145].
(“Рэчаіснасць”)

Працэс дэфармацыі хронасу і топасу адбываецца ў свядомасці лірычнага героя. У выніку мастацкага эксперыменту рэальнасць і ўмоўнасць становяцца настолькі непадзельнымі, што знікае магчымасць іх адрозніваць, а паэт-дэміург выступае стваральнікам так званай трэцяй рэчаіснасці. А. Разанаў сцвярджае, што “ў кірунку да гэтай – трэцяй – рэчаіснасці разгортваецца супярэчлівы рух гісторыі” [5, с. 55].

Такім чынам, архетып Сусветнага дрэва ў творчасці А. Разанава выступае ўніверсальнай мадэллю ўвасаблення хранатопу і рэалізуецца праз вызначальныя ў нацыянальнай ментальнай карціне свету дэндралагічныя вобразы: яблыню, дуб. Паяднoўваючы беларускую і японскую традыцыю, паэт стварае так званую трэцюю рэчаіснасць. Менавіта на гэтым узроўні рэалізуецца магчымасць вырашэння быційных праблем, бо трэцяя рэчаіснасць не ведае ніякіх абмежаванняў, а творца вызваляецца з-пад улады хронасу і з’яўляецца пазачасовым.

Літаратура:

1. Разанаў, А.С. Дождж: возера ў акупунктуры: Пункціры / А.С. Разанаў. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2007. – 162 с.
2. Разанаў, А.С. Танец з вужакамі: Выбранае / А.С. Разанаў. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 462 с.
3. Ікебана [Электронны рэсурс]/ Вікіпедыя. – Рэжым доступу: http://ru.wikipedia.org/wiki/Икебана – Дата доступу: 11.05.2012.
4. Разанаў, А.С. Лясная дарога: версэты / А.С. Разанаў. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2005. – 200 с.
5. Разанаў, А.С. З апокрыфа ў канон : гутаркі, выступленні, нататкі / А.С. Разанаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2010. – 138 с.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ РЭАЛІІ Ў ПАЭМЕ АДАМА МІЦКЕВІЧА «КОНРАД ВАЛЕНРОД»

Налётава Н.М.,
студэнтка 3 курса УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Аляксеева Т.У., ст. выкладчык

**Уводзіны.** Сярод найярчэйшых зорак рамантычнай еўрапейскай літаратуры XIX ст. адно з галоўных месцаў належыць Адаму Міцкевічу. Яго рамантычны прынцып «Май сэрца, глядзі ў сэрца!» абуджаў натуральную цікавасць да даўніны, фальклору, гісторыі і духоўнай культуры краю, скіроўваў творчасць паэта да тэмы нацыянальна-вызваленчай барацьбы насельнікаў былога Вялікага Княства Літоўскага. Мэта нашага даследавання: выявіць гістарычныя рэаліі ў паэме Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод». Метады даследавання: тэарэтычнае асэнсаванне навуковай літаратуры (аналіз) і апісанне гістарычных рэалій у паэме «Конрад Валенрод».

**Асноўная частка.** «Конрад Валенрод»Адама Міцкевіча – рамантычны твор, у якім знайшлі адлюстраванне гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, яго народа, слава і трагедыя, веліч духа і ўнутраная драма пэўнай асобы. Сваю паэму аўтар закончыў пасляслоўем, дзе абгрунтаваў гістарычную аснову твора: «Мы назвалі аповесць гістарычнай таму, што характарыстыка дзейных асоб і ўсё апісанне важнейшых падзей заснаваны на гістарычных фактах»[3,с.517]. Адам Міцкевіч указвае на выкарыстанне пры стварэнні паэмы хронік і «самых розных і супярэчлівых сведчанняў»[3,